Nation of Leaders

# Маніфест “Нацыі Лідараў”

***Наша місія** — садзейнічаць станаўленню актыўных удзельнікаў грамадзянскай супольнасці Беларусі.*

**“Нацыя Лідараў”** — гэта адукацыйны хаб для навучання, супрацоўніцтва і аб'яднання людзей, супольнасцяў і ініцыятыў на карысць станаўлення дэмакратычнай, незалежнай, паспяховай Беларусі.

**Мы — каманда**, якая стварае і развівае сваю шматфункцыянальную адукацыйную экасістэму для беларусак і беларусаў ва ўсім свеце. Мы спрыяем глыбінным зменам грамадзянскай самасвядомасці людзей і супольнасцяў, стварэнню і рэалізацыі імі магчымасцяў для паляпшэння якасці жыцця.

**Мы падзяляем** фундаментальныя **каштоўнасці**: правы чалавека, чалавечае жыццё і годнасць; свабода (слова, выбару, волі, фізічная); права, законнасць і справядлівасць. Нас, як беларусак і беларусаў, аб'ядноўваюць каштоўнасці ўстойлівасці і развіцця нашай грамадзянскай нацыі; бачанне Беларусі як незалежнай і квітнеючай краіны, якая задае трэнды і тэндэнцыі цывілізацыйнага развіцця. Для нас каштоўныя бяспека і экалагічнасць; павага, узаемападтрымка і талерантнасць; прафесіяналізм, эстэтычнасць і гарманічнасць.

**Наш хаб дапамагае беларускам і беларусам** развівацца ў актуальных для іх сферах, павышаць узровень ведаў і навыкаў, неабходных для пабудовы ўласнага жыцця і шчаслівай будучыні сваёй краіны. Мы імкнёмся стварыць пляцоўку для распрацоўкі і падтрымкі ініцыятыў, накіраваных на ўмацаванне патэнцыялу людзей, супольнасцяў і грамадства ў цэлым.

**Мы ўвесь час развіваемся і эксперыментуем**; пашыраем аўдыторыю нашага ўплыву, удасканальваючы методыкі і фарматы ўзаемадзеяння; ствараем новыя адукацыйныя прадукты, выкарыстоўваючы перадавы досвед і веды вядучых прафесіяналаў у сваіх сферах. **Мы кіруемся** калектыўным падыходам у вызначэнні мэт і прыняцці рашэнняў, улічваючы меркаванне ўдзельніц і ўдзельнікаў нашых праектаў.

**Мы імкнёмся развіваць міжнародную экасістэму нефармальнай грамадзянскай адукацыі дарослых**, аб'ядноўваючыся з правайдарамі адукацыйных паслуг, беларускімі і міжнароднымі арганізацыямі, бізнесам і іншымі зацікаўленымі суб'ектамі. Узаемадзеянне з партнёрамі мы будуем на прынцыпах этычнасці, даверу, кампетэнтнасці, узаемавыгаднасці, узаеманавучання і аб'яднання рэсурсаў.

*Фонд грамадзянскага развіцця Nation of Leaders — некамерцыйная арганізацыя, зарэгістраваная ў Польшчы 9 жніўня 2021 года пад нумарам 0000914944.*